Зубчонак, Н. А.

Беларуская журналістыка ў перыяд станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху (1906—1916 гг.) : дапам. для студэнтаў Інстытута журналістыкі,

/ Н. А. Зубчонак. Мінск ; БДУ, 2010.

**1.3. ФАРМІРАВАННЕ СІСТЭМЫ БЕЛАРУСКАГА ЛЕГАЛЬНАГА ДРУКУ (1906—1916 гг.)**

Падзеі першай рускай рэвалюцыі адкрылі новую старонку ў гісторыі вызваленчага руху і класавай барацьбы, легальнай прэсы Беларусі, якая адлюстравала складаны працэс пераўтварэнняў у краіне. Царызм імкнуўся паўплываць на друк, з аднаго боку, шляхам адміністрацыйных і крымінальна-паліцэйскіх мер; з другога — шляхам ілжывых уступак, з мэтай падпарадкаваць сабе адзін з галоўных сацыяльных інстытутаў у краіне. Жорсткія цэнзурныя ўмовы рабілі немагчымым свабоднае развіццё прэсы: «Калі паглыбіцца ў закон аб друку, то акажацца, што амаль няма такога пытання, аб якім можна было б пісаць, і што ўсе газеты павінны быць закрыты як парушаючыя закон аб друку» [66, с. 8].

Нягледзячы на ўсе перашкоды, прэса Паўночна-Заходняга краю працягвала развівацца ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі пэўных накірункаў.

Легальнае становішча, у якім апынуўся друк расійскіх ускраін, дазволіла згуртавацца грамадскім сілам, каб супрацьстаяць афіцыйнаму расійска-польскаму ўплыву на свядомасць жыхароў народа Беларусі.

Пасля першай рускай рэвалюцыі беларускамоўныя выданні пачынаюць займаць галоўнае месца ў сістэме друку Паўночна-Заходняга краю. Нягледзячы на намаганні царскіх уладаў забараніць друкаванае слова на беларускай мове, гэты перыяд гісторыі нашай краіны стаў пачаткам новага этапа ў развіцці айчыннай літаратуры, кнігадрукавання, усталявання ў грамадскай свядомасці перадавых ідэйна-эстэтычных прынцыпаў. Успамінаючы тыя нялёгкія часы, Я. Купала пісаў: «Калі ў памятным 1905 г. адбылася завіруха, калі ў Расіі пачала душа абуджацца да новага жыцця, да новага шчасця, то і ў беларуса пачало абуджацца пачуццё свайго “я”, стала лунаць даўно дрэмлючая думка, што і мы людзі» [«Наша ніва»,1913, № 30].

Лепшыя нацыянальныя памкненні народа знайшлі ўвасабленне ў дзейнасці першых выданняў на роднай мове, стварэнні беларускіх выдавецтваў у Мінску, Вільні, Пецярбургу.

Друкаваныя матэрыялы беларускамоўных газет і часопісаў сталі сродкам нацыянальнага адраджэння народа. Шматлікія літаратурныя творы, якія з’яўляліся на іх старонках, адначасова з эстэтычнай выконвалі функцыю палітычную, грамадскую, асветніцкую, навуковую. Маладыя беларускія паэты і пісьменнікі сталі першымі публіцыстамі,

крытыкамі, карэспандэнтамі, палітыкамі і, безумоўна, мысліцелямі свайго часу. Мастацкая творчасць і публіцыстыка выступілі дзейснымі сродкамі развіцця сацыяльнай і палітычнай актыўнасці, інструментам барацьбы за народныя ідэалы, а публіцыстыка разам з літаратурай ў гэты час былі асноўнымі формамі выражэння грамадскай думкі. У рэвалюцыйны перыяд літаратура мела «ярка выражаны праграмна-публіцыстычны характар. Сама ж публіцыстыка, навукова-папулярная літаратура, літаратурная крытыка ўяўлялі сабой своеасаблівы каментарый ідэй, выражаных у паэзіі з дапамогай мастацкіх вобразаў» [38, с.33].

Нягледзячы на праследаванні з боку дзяржаўных улад, беларуская прэса здолела падвергнуць усебаковай крытыцы існуючы ў краіне грамадска-палітычны лад. Праз большасць друкаваных матэрыялаў праходзіла думка: толькі ва ўмовах палітычных і грамадскіх свабод магчыма паступовае пераадоленне сацыяльнай і нацыянальнай несправядлівасці.

Для завяршэння справы нацыянальнага адраджэння неабходны былі шырокія грамадскія сілы. У Беларусі ў пачатку XX ст. іх было недастаткова. Больш таго, культурны слой тагачаснага насельніцтва складалі прадстаўнікі расійскага чыноўніцтва, польскія нацыяналісты, яўрэйскае мяшчанства. Ні адна з пералічаных вышэй катэгорый не вызначалася вялікай прыхільнасцю да простага народа.

Увесь цяжар складанай работы па адраджэнню беларускай нацыі, яе культуры, па фарміраванню нацыянальнай ідэі лёг на плечы прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Менавіта яна заўсёды з'яўлялася і з'яўляецца выразнікам самых перадавых ідэй. Ад яе ўзроўню – сацыяльнага і інтэлектуальнага – залежыць, нарэшце, стан самасвядомасці, развіццё грамадства ў цэлым.

Падзеі 1905 г. ажыццявілі сапраўды глыбокі пераварот у свядомасці народных мас. На першы план выступілі пытанні, якія патрабавалі неадкладнага вырашэння. У гэтых умовах наперад выйшаў новы пласт прадстаўнікоў народнай інтэлігенцыі. У гісторыі тагачаснага грамадства гэта стала сапраўды выключнай з'явай. Аб шырыні і сур'ёзнасці адраджэнскага руху ў Беларусі можна меркаваць, зыходзячы са зместу беларускіх выданняў, якія ўбачылі свет паміж дзвюма рэвалюцыямі, і, у першую чаргу, «Нашай нівы». «Асобы, якія аб'ядналіся вакол "Нашай нівы", выраслі ў народзе, ад народа не адарваліся, ім вядомы народныя патрэбы і народныя язвы, блізкая псіхіка народа; яны ведаюць народ і народ ведае іх, ведае і верыць ім. Менавіта таму іх праца абяцае быць прадуктыўнай, менавіта таму мы і рашаемся сказаць, што культурны рух беларускага краю адчуў, нарэшце, пад сабою цвёрды грунт, што ўсё больш моцная жыццёвая сіла дзейнічае ў ім» [6, с.213].

М. Багдановіч надаваў вялікае значэнне ролі інтэлігенцыі ў грамадскім жыцці. Разважанні па гэтым пытанні змешчаны ў яго

шматлікіх аналітычных працах. Заслугоўваюць увагі думкі, выказаныя ў артыкуле «Новая інтэлігенцыя», які быў надрукаваны ў 1914 г. у расійскім часопісе «Жизнь для всех». Погляды аўтара на сутнасць паняцця «інтэлігенцыя» можна лічыць эвалюцыйнымі, паколькі перад намі прамое сведчанне наступлення новай эпохі, усталявання новай грамадскай свядомасці. З пазіцый сённяшняга дня можна аспрэчваць некаторыя сцвярджэнні публіцыста, але варта пераканацца ў тым, што большай часткай яны сапраўды слушныя. «На наш погляд, усялякі інтэлігент павінен адпавядаць наступным двум патрабаванням: па-першае, ён павінен імкнуцца да ведаў; па-другое, ён павінен імкнуцца несці свае веды на карысць народу. Вось рысы, якія вызначаюць сабой сутнасць духоўнага вобліку інтэлігенцыі» [7, с.15].

Аўтар прапануе, на першы погляд, уласную формулу разумення ролі інтэлігенцыі ў грамадстве. У рэчышчы палітычных падзей канца XIX – пачатку XX ст. дадзенае выказванне знайшло сваё пацвярджэнне. На першы план у адраджэнцкім руху выходзілі прадстаўнікі сярэдняга і нават ніжэйшага маёмасных класаў, якім вядомы былі праблемы простага народа. Прадстаўнікі вышэйшых саслоўяў не пераставалі быць інтэлігенцыяй, але іх колькасць змяншалася, іх погляды шмат у чым не адпавядалі патрабаванням часу. Новыя нацыянальныя сілы былі яшчэ слабымі. Беларускае адраджэнне павінна было абапірацца на традыцыі многіх папярэдніх пакаленняў расійскай інтэлігенцыі. На жаль, гэтага не адбылося. Нацыянальны рух, які актывізаваўся пасля 1905 г., быў вынікам працы і творчасці лепшых прадстаўнікоў беларускага народа. Папярэднія пакаленні зрабілі шмат, але засталося амаль нерэалізаваным патрабаванне несці ў народ свае веды, дапамагаць простаму чалавеку стаць паўнапраўным грамадзянінам.

Важнай адметнасцю грамадскага руху пачатку XX ст. стала нараджэнне новай інтэлігенцыі — народнай і нацыянальнай. Яна з’явілася сапраўды моцнай сілай, аказала вялікі ўплыў на свядомасць народа. З. Шыбека адзначаў: «Праслойка нацыянальнай інтэлігенцыі хоць і была нязначнай, але зусім дастатковай для выпрацоўкі эстэтычных ідэалаў беларускай культуры» [75, с. 186].

Адсутнасць традыцый папярэдніх пакаленняў, вопыту грамадскай дзейнасці значна ўскладнілі нацыянальны рух. «Новы слой інтэлігенцыі, які адкладаецца на нашых вачах, мае зусім іншую афарбоўку. Ён складаецца з элементаў, праўда, менш складаных і менш культурных, але затое больш дзельных, больш здаровых і працаздольных. Менавіта працоўная інтэлігенцыя, якая ўзнікла ў недрах народа, не адрываецца ад яго: гэта той жа народ, толькі больш высокі і разумова, і маральна» [7, с. 23].

Дзякуючы намаганням маладых прагрэсіўных сіл, на старонках першых беларускамоўных выданняў, ва ўмовах жорсткай палемікі з рэакцыйнымі газетамі і часопісамі, былі сфармуляваны асноўныя задачы адраджэння беларускай дзяржавы і самасвядомасці яе народа:

- нацыянальнае адраджэнне па сваёй сутнасці скіравана ў этнічную і сацыяльную гісторыю народа;
- яго развіццё залежыць ад развіцця навукі, адукацыі, мастацтва і літаратуры;
- паказчыкам ўзроўню самасвядомасці народа з’яўляецца дакладная выяўленасць яго адносін да свайго мінулага, сучаснага і будучага;
- працэс развіцця адраджэння абумоўлены своеасаблівасцю нацыянальнага погляду на рэчаіснасць.

У сувязі з гэтым беларускія выданні аказаліся ў самых складаных умовах. Ідэя стварэння самастойнай дзяржавы са сваёй нацыянальнай мовай і культурай на працягу доўгага часу падвяргалася рэзкай крытыцы з боку польскіх і расійскіх выданняў («Kurier Warszawski», «Prawda», «Kurier Litewski», «Gazeta codzienna», «Русское знамя», «Московские ведомости», «Голос Москвы», «Новое время» і інш.). Сам факт з’яўлення беларускай прэсы быў успрыняты варожа, паколькі гэта, «з аднаго боку, падрывала паланізацыю беларускага сялянства, з другога – расейцы пабачылі ў беларускай прэсе праявы сепаратызму, што перашкаджала русіфікацыі гэтага краю» [15, с.154].

Гісторыя дзейнасці кожнага беларускамоўнага выдання міжрэвалюцыйнага перыяду, незалежна ад працягласці выхаду, заслугоўвае таго, каб быць вывучанай і асэнсаванай нашчадкамі. Кожная газета ці часопіс у гэты час упершыню прайшлі шляхам распрацоўкі асноў тэорыі нацыянальнай дзяржавы, сутыкнуліся з ідэалагічнымі, палітычнымі перашкодамі, з якіх і быў пабудаваны гэты шлях. Тым не менш, ён вёў да адраджэння сваёй нацыі, адстойваў права беларусам жыць і працаваць у свабоднай і дэмакратычнай краіне.

У 1906 г. выйшла першая беларуская легальная газета «Наша доля». Праз паўстагоддзя пасля выдання «Мужыцкай праўды» К. Каліноўскага народ атрымаў магчымасць гаварыць пра набалелае, надзённае сваёй мовай. Выдаўцы адзначылі, што маюць намер «пісаць ... для вёскі і ... бараніць правы вясковых людзей». Але ўжо 2 верасня 1906 г. першы нумар газеты быў канфіскаваны. Пазней канфіскацыя была знята судом. З вялікімі цяжкасцямі ўдалося выпусціць 6 нумароў «Нашай долі». Жорсткі цэнзурны ўціск не даў магчымасці газеце развівацца.

Нават у больш-менш спрыяльных палітычных умовах, пры адносна свабоднай цэнзуры не магло доўга існаваць выданне з падобным зместам. Праблемы адраджэння нацыянальнай свядомасці беларускага народа, спрадвечнае імкненне да незалежнасці, барацьба за права мець сваю мову, развіваць уласную культуру не знаходзілі падтрымкі ні сярод улад былой Расійскай імперыі, ні сярод дэмакратычна настроенага бальшавіцкага руху.

Справа нацыянальнага адраджэння ішла наперад. Беларускія прагрэсіўныя сілы разумелі, што ў гэты час з’явілася рэальная

магчымасць заявіць аб сабе. У тым жа 1906 г. выйшла ў свет «Наша ніва». Гэтаму выданню было наканавана замацаваць і прадоўжыць традыцыі, закладзеныя ў «Нашай долі». У першым сваім нумары рэдакцыя заявіла, што будзе служыць «усяму беларускаму скрыўджанаму народу» незалежна ад класавай прыналежнасці; у той жа час падкрэслівалася, што яна арыентуецца не на памешчыкаў і фабрыкантаў, а на працоўны народ, які «апрача сваіх рук ды працы нічога не мае» [«Наша ніва», 1906, 10/23 лістапада]. Гэта выступленне рэдакцыі ўказвала на тое, што грамадска-палітычная пазіцыя «Нашай нівы» была даволі канструктыўнай, пазней праявілася яе неадназначнасць, бо ў пэўных выпадках «залежала ад канкрэтнай сітуацыі, светапогляду рэдактараў і аўтараў, сумяшчала ліберальна-дэмакратычную і буржуазна-ліберальную скіраванасць» [68, с. 102]. Аднак у гады сталыпінскай рэакцыі «Наша ніва» была адзінай дэмакратычнай легальнай нацыянальнай газетай, цэнтрам беларускага нацыянальнага жыцця.

З нашаніўскага часу беларуская літаратура перайшла на новы шлях паскоранага развіцця; на старонках газеты адбываўся паступовы працэс фарміравання беларускай літаратурнай мовы, нормаў правапісу; значна ажывілася баларуская журналістыка і кнігадрукаванне. “Наша ніва” імкнулася наблізіць грамадства да вырашэння важных праблем: пісала пра неабходнасць увядзення ўсеагульнай абавязковай бясплатнай адукацыі з забеспячэннем права і магчымасці вучыцца на роднай мове); расказвала пра культуру беларусаў, заклікала да вырашэння пытанняў, звязаных з умовамі быту, вядзення гаспадаркі, знаёміла чытачоў з навейшымі дасягненнямі ў галіне навукі.

У розныя часы па-рознаму ацэньвалася дзейнасць гэтага выдання. У перыяд панавання той ці іншай ідэалагічнай установкі «Наша ніва» заўсёды аказвалася ў цэнтры ўвагі. Напрыклад, у 1932 г. у Мінску выйшаў зборнік матэрыялаў пасяджэння камісіі гісторыкаў-марксістаў Беларусі пад назвай «Дыскусія аб “Нашай ніве”. Пасяджэнне ператварылася ў сапраўдны суд над выданнем, дзе газета абвінавачвалася ў «пошуках згоды з пануючымі класамі», у «пераходзе на бок сталыпінскай рэформы», у «паклёпе на рабочы клас», у «прапагандзе супраць класавай барацьбы», у «адмаўленні ад рэвалюцыйнай тактыкі» і інш. Найбольш вострыя выказванні ў адрас «Нашай нівы» гучалі тады, калі гаворка ішла пра нацыянальнае пытанне, у прыватнасці, пра неабходнасць адраджэння нацыянальнай культуры, мовы: «Выходзіць, без папа і ксяндза нашаніўцы не могуць падымаць беларускую культуру. Адна ўмова толькі станавіцца — ужыванне беларускай мовы”. Далей прамоўца спасылаўся на выказванне рэдакцыі: «Самая моцная рэч, каторая зближае свяшчэнніка ці ксяндза з мужыком-беларусам, ёсць яго бацькоўская мова. [«Наша ніва»,1911, № 8]. І ў якасці высновы, прыводзіліся словы Леніна аб тым, што «нацыянальная культура наогул (г. зн. тая, якую

прапагандуюць нашаніўцы) ёсць культура памешчыкаў, папоў і буржуазіі» [27, с. 20].

У 1930-я гг. быў вынесены прыгавор не толькі «Нашай ніве», але і ўсяму беларускаму руху, яго лепшым прадстаўнікам, мове і культуры цэлага народа. «Ён (нашаніўскі рух — З. Н.) даў Цвікевічаў, Лёсікаў, Ластоўскіх ды інш., якія з дапамогай інтэрвентаў імкнуліся накінуць пятлю капіталістычнай няволі на шыю рабочых і сялян савецкай Беларусі і зрабіць з пралетарскай дзяржавы дзяржаву капіталістаў, памешчыкаў і кулакоў-міраедаў» [27, с.58]. Падобныя ацэнкі сустракаюцца даволі часта. Асабліва вострыя выказванні гучалі ў адносінах да беларускага руху ў Вільні ў час першай сусветнай вайны, да дзейнасці «Homana» і В. Ластоўскага.

Больш за паўстагоддзя замоўчвалася і скажалася рэальнае значэнне грамадскай працы «Нашай нівы». Савецкія гісторыкі называлі газету «штотыднёвікам буржуазна-нацыяналістычнага накірунку... які выдаваўся групай нацыяналістаў – членаў БСГ» [55, с. 47]. Галоўная прычына, на нашу думку, у тым, што ва ўсе часы меркаванні аб самастойнасці беларускай нацыі, аб незалежнасці Беларусі лічыліся непрымальнымі. Беларусь як частка вялікага славянскага адзінства раствaралася ў культуры і дзяржаўнасці Расійскай імперыі.

Працэс адраджэння, распачаты ў 1906 г., не мог быць працягнуты ў савецкі час. Па гэтай прычыне сёння зноў застаюцца актуальнымі і моўная праблема, і лёс беларускай школы, і пытанні нацыянальнай ідэі і дзяржаўнасці. У свой час выдаўцы «Нашай нівы» зрабілі вельмі шмат у гэтым накірунку і, магчыма, не было б сёння столькі нявырашаных праблем, каб захоўвалася пераемнасць поглядаў, ідэй, аб’ектыўная ацэнка гістарычных падзей.

На працягу XX ст. са зменай палітычнага ладу ў Беларусі змяняліся адносіны і да гэтага выдання. Чаму? Пытанне даволі складанае, але, у той жа час, вельмі важнае — для асэнсавання гістарычнага мінулага і будучыні нашай дзяржавы. Самае моцнае ў кожным народзе — яго нацыянальныя карані, усведамленне ўласнай годнасці, настойлівае жаданне яе захаваць. Найбольш вострыя канфлікты і супярэчнасці ў свеце ўзнікаюць менавіта на нацыянальнай глебе.

Амаль дзесяцігоддзе дзейнасці «Нашай нівы» стала першым і найбольш важным этапам у развіцці беларускага легальнага друку і нацыянальнага кнігадрукавання. Традыцыі, закладзеныя гэтым выданнем, адкрылі шлях іншым газетам і часопісам на беларускай мове, зрабілі магчымым існаванне ў жорсткіх умовах спаду рэвалюцыі ўласных выдавецкіх суполак і нават асобных выдавецтваў. У 1912 г. з аддзела «Нашай нівы» вылучыўся асобны часопіс «Саха». Яго рэдакцыя займалася таксама выпускам навукова-папулярных кніг на сельскагаспадарчыя тэмы. Праз некаторы час пачаў выходзіць часопіс для студэнцкай моладзі «Раніца» (1914 г.), а таксама друкаваўся

дзіцячы і краязнаўчы часопіс «Лучынка» (1914 г.). Апошні спрабаваў наладзіць у Мінску выданне дзіцячай літаратуры. У 1912--1913 гг. былі выдадзены ў Пецярбургу тры кнігі альманаха «Маладая Беларусь». З 1909 па 1915 г. рэгулярна друкаваліся календары і зборнікі «Нашай нівы». Для беларусаў-католікаў выходзіла газета «Bielarus» (друкавалася лацінкай). У 1912 г. убачыў свет першы беларускі сатырычны часопіс «Крапіва».

У міжрэвалюцыйны перыяд у Беларусі былі заснаваны першыя нацынальныя выдавецтвы. У 1906–1914 гг. у Пецярбургу дзейнічала выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца», у 1910 г. было заснавана выдавецтва А. Грыневіча, на рахунку якога 10 кніг тыражом 28 200 экземпляраў [59].

Выдавецкая дзейнасць разгортвалася і ў Мінску. Тут у 1906–1907 гг. дзейнічала таварыства «Мінчук». У 1915 г. было заснавана выдавецтва «Вясёлка», якое, на жаль, змагло выпусціць усяго толькі адну кнігу.

Найбольш актыўныя культурныя сілы згуртаваліся ў Вільні, побач з рэдакцыяй «Нашай нівы». Усе матэрыялы, выдадзеныя «Нашай нівай», з'яўляліся своеасаблівым дадаткам да газеты, перадрукоўкай або адбіткамі асобных газетных матэрыялаў. Нашаніўскае выдавецтва толькі за першыя пяць гадоў сваёй дзейнасці выпусціла 20 розных кніжак [50, с. 432].

У 1908–1911 гг. у Вільні дзейнічала выдавецкая суполка «Наша хата», якая выпусціла 6 кніг тыражом 15000 экземпляраў. Захавалася зусім мала звестак пра выдавецтва «Палачанін», якое надрукавала ў Вільні дзве кнігі. Найбольш моцным было «Беларускае выдавецкае таварыства ў Вільні», якое дзейнічала з 1913 па 1916 г. [59].

Дзесяцігоддзе выхаду «Нашай нівы» стала першым вялікім крокам на шляху развіцця легальнага друку і кнігадрукавання. У перыяд з 1908 па 1914 г. выйшлі ў свет 77 беларускіх кніжак агульным накладам 226 660 асобнікаў [50, с. 432].

У літаратуразнаўстве гэты час атрымаў назву «нашаніўскага перыяду». Дадзенае азначэнне можа лічыцца абсалютна правільным. Магчыма і нельга звязваць гісторыка-культурны працэс цэлага дзесяцігоддзя толькі з адным выданнем. Тым не менш, у развіцці беларускай нацыянальнай культуры гэты час стаў менавіта «нашаніўскім», паколькі ўсё, што было зроблена тады, ствaралася пад уплывам «Нашай нівы», а БСГ надавала вялікае значэнне беларускаму легальнаму друку і кнігадрукаванню на беларускай мове.

Дзейнасць першых нацыянальных газет і часопісаў, выдавецтваў і выдавецкіх суполак у перыяд паміж дзвюма рэвалюцыямі аказалася нядоўгай. Добра распачатую беларускую справу спыніла першая сусветная вайна. З 1914 г. з набліжэннем фронту пачалі адно за другім закрывацца беларускія выданні, выдавецтвы і выдавецкія суполкі. У 1915 г. была зачынена і «Наша ніва».

У 1915 г. яшчэ былі спробы наладзіць выпуск беларускіх газет, часопісаў і кніг, але складаная палітычная сітуацыя ў краіне адмоўна адбілася на развіцці беларускага нацыянальнага руху. У 1914 г. Э. Будзькам у Вільні рыхтавалася выданне беларускага ілюстраванага часопіса «Siabra», аднак задуму рэалізаваць не ўдалося. Праз паўгода ўжо ў акупаванай немцамі Вільні выйшла беларуская газета «Homan», рэдакцыя якой (на чале з В. Ластоўскім) працягвала прапагандаваць ідэю стварэння незалежнай Беларускай рэспублікі або федэратыўнага Беларуска-Літоўскага краю на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага. Выданне газеты было спынена ў 1918 г.

У сувязі з тым, што Вільня была захоплена немцамі, частка дзеячаў беларускага нацыянальнага руху пераехала ў Пецярбург і там у 1916 г. спрабавала наладзіць выпуск некалькіх выданняў. У лістападзе 1916 г. выйшлі адразу дзве газеты на беларускай мове — «Дзянніца» і «Swietač» (друкавалася лацінкай). У снежні гэтага ж года на сёмым нумары «Дзянніца» спыніла выданне. З-за фінансавых цяжкасцей у тым жа месяцы была зачынена і другая газета.

Беларускія выданні міжрэвалюцыйнага перыяду занялі належнае месца ў сістэме прэсы. У гэты час пачынала складвацца беларуская школа публіцыстыкі. Нацыянальныя газеты і часопісы ні па форме, ні па змесце не ўступалі расійскім выданням. Літаратура захавала нямала водгукаў самых паважаных людзей таго часу ў адрас нашых выданняў. Напрыклад, у 1912 г. у расійскіх «Биржевых ведомостях» прафесар Пагодзін пісаў пра кніжкі «Беларускага календара “Нашай нівы”. Ён адзначаў, што расійскім выдаўцам не пашкодзіла б звярнуць увагу на гэтыя выданні як на адны з лепшых, якія ёсць зараз у краіне. А каштоўнасць іх, у першую чаргу, заключаецца ў тым, што календары з’яўляюцца сведчаннем вялікай культурнай работы, якая разгортваецца ў Беларусі. Зразумела, што «гэтай справе, пазбаўленай шавінізму і дробнага палітыканства, нельга не спачуваць усёй душой» [9, с. 2].

Крыху пазней, у 1914 г., у часопісе «Народы и области» быў надрукаваны артыкул аб беларускім руху, дзе зноў звярталася ўвага на выданні «Нашай нівы», указвалася на іх вялікую ролю ў нацыянальным адраджэнні: «Пазбаўлены нацыяналістычнай тэндэнцыі і пастаўлены лёсам сярод варожых плыняў, абумоўлены разнастайнасцю народаў, палітык і рэлігій, якія акружаюць жыццё беларуса, каляндар «Нашай Нівы» прыносіць у беларускую хату высокакультурны пачатак і прымушае зайздросціць народу, які валодае такім магутным сродкам асветы» [10, с. 4].

У найскладанейшы час палітычнай рэакцыі і жорсткіх рэпрэсій беларусы мелі сваю нацыянальную прэсу. Больш таго, менавіта «нашаніўскі» перыяд стаў для яе парой станаўлення і далейшага росквіту. Лепшыя матэрыялы былі надрукаваны ў гэты час. Пацвярджэннем з’яўляецца жанравая разнастайнасць газетных

публікацый, багацце самых розных рубрык, нарэшце, высокі ўзровень папулярнасці беларускай прэсы сярод чытачоў.

Напярэдадні рэвалюцыі 1917 г. перасталі існаваць практычна ўсе беларускія легальныя выданні. Нацыянальны рух завяршыў першы і вельмі значны этап свайго развіцця. Гэты перыяд у гісторыі нашай краіны стаў часам усведамлення беларусамі сябе як самастойнай нацыі, часам выспявання думкі аб уласнай дзяржаўнасці. Увасабленнем гэтых ідэй былі першыя беларускія выданні, якія з’явіліся значнай часткай агульнай сістэмы легальнага друку, яе галоўнай адметнасцю.